Ogłoszenia parafialne

Wielki Post 3 niedziela

19 marca 2022

на нядзелю 20.03.2022

1. Падчас Вялікага Посту крыжовы шлях у пятніцу ў 18.30 (падрыхтоўвае супольнасць MISERICORS) і ў нядзелю крыжовы шлях ў 10.30.
2. Песні Жальбы ў нядзелю перад св. Імшой ў 14:30.
3. У пятніцу - Урачыстасць Звеставанння Пана, а разам з ёй "Дзень Святасці Жыцця". У гэты дзень можна распачаць малітву Духоўнага Усынаўлення. Прашу прынесці свечкі.
4. **Ва ўрачыстасць Звеставанння Пана 25 сакавіка, падчас пакаяннага набажэнства ў ватыканскай базыліцы святога Пятра, Папа Францішак прысвеціць Расію і Украіну Беззаганнаму Сэрцу Марыі.** Адначасова гэта здзейсніць у Фаціме Папскі элемазінарый кардынал **Конрад Краеўскі**, які ў якасці спецпрадстаўніка Папы на мінулым тыдні прыбыў ва Украіну.

Гэта адказ на словы Маці Божай, якая падчас аб’яўлення 13 ліпеня 1917 года ў Фаціме прасіла аб прысвячэнні Расіі Яе Беззаганнаму Сэрцу. Багародзіца асцерагла, што, калі гэтая просьба не будзе выканана, Расія працягне распаўсюджваць «свае памылкі па ўсім свеце, спрыяючы войнам і пераследу». **У гэты дзень запрашаю** на ружанец (7.30) і крыжовы шлях (18.30), Эўхарыстыю (8.00 і 19.00), яднаючыся са Святым Айцом Францішкам і прасіць аб міры, каб спыніць руку Каіна, якая знішчае і забівае.

5. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.